

# БІЯГРАФІЯ

**Сяроў Мікалай Іванавіч – 5.04.1958 года.**

Нарадзіўся ў г. Скідалі Гродзенскага раёна Гродзенскай вобл. у сям'і настаўніка. Паэт. Член СПБ. Дзіцячыя гады (да 6 гадоў) прайшлі ў в.Бершты і в.Азёры на Гродзеншчыне. У 1965г. сям'я пераехала ў Скідаль, дзе з 1966 да 1976г. жыў і вучыўся. Закончыўшы сярэднюю палітэхнічную школу №2 з залатым медалём, у 1976г. паступіў у БДУ на навукова-вытворчае аддзяленне фізфака. Адтуль быў прызваны ў рады СА, службу праходзіў на Поўначы. З 1979г да 1981г. працаваў, набываў розныя прафесіі на прадпрыемствах г.Гродна і г. Масквы, а таксама – у будаўніцтве.

З 1981г. і да цяперашняга часу працуе ў ОАО "Скідальскі цукровы камбінат" на пасадзе намесніка генеральнага дырэктара (з 2006г.), прайшоўшы шлях ад радавога рабочага да старшыні Наглядальнага Савета ОАО (з 2003г.).

З 1985г. па 1993г. вучыўся ў БДТУ (дыплом з адзнакай) і аспірантуру, здаў кандыдацкія экзамены.

Пісаць пачаў у раннім дзяцінстве, друкавацца пачаў з 2004г. (у перыядычным друку, у альманахах "Нябесны знак"). Выдаў кнігі паэзіі "Синий сон" (2006, Мінск, "Конфида"), у 2008г. там жа выдадзены кнігі "Над озером белым" і "Ночные дожди ". Жыве ў г.Гродна.